# СІЛАНЦЬЕВА НАДЗЕЯ СЯМЁНАЎНА



**Дата смерці:** кастрычнік 1942

**Месца подзвігу:** г. Орша, Віцебская вобласць

**Дата подзвігу:** 1943

**Ушанаванне:** Віцебская вобл., г. Орша – мемарыяльная дошка

У гады Вялікай Айчыннай вайны – удзельнік і арганізатар Аршанскага камуністычнага падполля. Яна падтрымлівала цесныя сувязі з членамі Аршанскага падпольнага партыйнага цэнтра КП(б)Б Л. Н. Анкіновічам і А. Г. Шкабарыным. З 1941 г. да кастрычніка 1942 г. узначальвала падпольную групу, у склад якой уваходзілі яе браты В. С. і П. С. Сіланцьевы, маці А. А. Сіланцьева. Дом Сіланцьевых быў явачнай кватэрай падпольшчыкаў, тут знаходзілі прытулак савецкія ваеннапалонныя, што ўцякалі з лагераў. У двары дома быў тайнік, дзе падпольшчыкі хавалі зброю і боепрыпасы. Члены групы збіралі разведданыя аб праціўніку, вялі антыфашысцкую прапаганду, пісалі і распаўсюджвалі лістоўкі. У кастрычніку 1942 года гітлераўцы натрапілі на след падпольшчыкаў. Яны схапілі Н. С. Сіланцьеву, яе маці, братоў і іншых патрыётаў і пасля катаванняў расстралялі.

У 1975 годзе на доме, дзе базіравалася явачная кватэра ў ваенны час, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Дулеба, Г. І.** Явачная кватэра / Г. І. Дулеба // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1985. – С. 98–99.

2. **Моцныя** духам // Ленінскі прызыў (Орша). – 1976. – 22 кастр. – С. 2.

3. **Никогда** не забудутся их подвиги: о коммунистическом подполье в годы Великой Отечественной войны в городе Орше и Оршанском районе (июль 1941 г. – июнь 1944 г.) // Советская Белоруссия. – 1972. – 23 авг. – С. 2.

**Моцныя** духам // Ленінскі прызыў (Орша). – 1976. – 22 кастр. – С. 2.

## МОЦНЫЯ ДУХАМ

У даваенныя гады ў Задняпроўі жыла звычайная савецкая сям'я Сіланцьевых. Алена Архіпаўна рана заўдавела, на яе выхаванні засталіся два сыны – Павел і Васіль, старэйшая дачка Надзея. Не ва ўсім сям'я мела дастатак, але не ў ім бачыла Сіланцьева галоўнае. Сваім грамадзянскім абавязкам лічыла яна вырасціць дзяцей дастойнымі грамадзянамі Краіны Саветаў.

Перад вайной Надзея скончыла Аршанскі настаўніцкі інстытут і пачала працаваць настаўніцай у адной са школ горада. А ў 1940 годзе партыя накіроўвае камуністку Надзею Сямёнаўну Сіланцьеву дырэктарам школы ў адзін з вызваленых раёнаў Заходняй Беларусі.

Але працаваць там давялося нядоўга. Пачалася вайна. Дабраўшыся да Оршы, Надзея Сямёнаўна з'явілася ў гарком партыі, дзе ўжо стваралася партыйна-камсамольскае падполле. Яна дала згоду застацца ў тыле ворага. Неўзабаве яе прызначаюць партарганізатарам партыйнага падполля.

Спачатку ў падпольную групу ўвайшлі маці і два браты, а іх дом стаў явачнай кватэрай для падпольшчыкаў. Лёгка сказаць «явачнай кватэрай». Усякі, хто прадастаўляў сваё жыллё для гэтых мэт, добра разумеў, што чакае яго і яго блізкіх у выпадку правалу.

Падпольная група папаўняецца смелымі камсамольцамі і сталымі людзьмі, якіх Надзея ведала яшчэ ў даваенныя гады як сумленных і непадкупных. Так стварылася моцная, згуртаваная падпольная група. Спачатку выпускалі лістоўкі, якія пісаліся ад рукі, а ноччу распаўсюджваліся. Часам яны наклейваліся на загады і распараджэнні акупантаў, і насельніцтва «легальна» чытала заклікі падпольшчыкаў. Затым пачалі збіраць зброю і боепрыпасы. Асобныя вінтоўкі патрабавалі рамонту, і за гэтую справу ўзяўся старэйшы член падпольнай групы Яфім Кандратавіч Лучко. Уся зброя перапраўлялася партызанам. А колькі патрабавалася смеласці і вынаходлівасці, каб звязвацца з лагерамі ваеннапалонных і выводзіць адтуль савецкіх салдат на волю! І не адзін, не дзесятак, а сотні іх было выратавана ад немінучай гібелі. Яны ўліліся ў рады народных мсціўцаў.

У патрыётаў хапала храбрасці і мужнасці, але не хапала навыкаў канспірацыі. А гэта ў тых цяжкіх умовах было вельмі важна.

...Аднойчы ў акно дома Лучко раздаўся асцярожны стук. На парозе стаяў чалавек у камбінезоне лётчыка з ордэнамі на грудзях. Пераконваў, што ён з падбітага савецкага самалёта, і прасіў прыстанішча. Яфім Кандратавіч паверыў і прыняў яго ў сваю сям'ю. А гэта быў закляты фашысцкі агент Немчынаў, які, уцёршыся ў давер'е, выведаў, чым займаецца яго сям'я і сям'я Сіланцьевых. У кастрычніку 1942 года гэтыя сем'і арыштавалі.

Вось што даносіў аб гэтым свайму начальству садыст-следчы: «Аднаму спецагенту, які маскіраваўся пад савецкага чалавека, удалося пранікнуць і заваяваць давер'е адной рускай сям'і ў г. Оршы… Так стала магчымым арыштаваць небяспечную сям'ю Лучко... і Сіланцьевай Алены з яе дарослымі дзецьмі Паўлам і Васілём, дачкой Надзеяй. Гэтая сям'я давала прытулак ўцёкшым ваеннапалонным з лагераў, якія мелі жаданне пайсці да партызан. Праз іх атрымлівалі месцы явак, яны ж забяспечвалі прадуктамі харчавання, зброяй. Дачка Надзея Сіланцьева, настаўніца і камуністка, займалася камуністычнай прапагандай сярод моладзі і насельніцтва, распаўсюджвала лістоўкі. Была звязана з кіраўніцтвам падполля. Усе яны расстраляны...».

Іх страшэнна катавалі, але ўсе яны трымаліся мужна. І следчы настолькі быў здзіўлены стойкасцю патрыётаў, што вымушаны быў запісаць: «Лягчэй было з каменя ваду выціснуць, чым дабіцца ад іх выдачы сваіх паплечнікаў». Аршанцы свята ўшаноўваюць памяць загінуўшых патрыётаў. Па вуліцы 1-й Лагернай на доме № 37 устаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «Тут у перыяд Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася явачная кватэра падпольнай групы пад кіраўніцтвам члена КПСС Надзеі Сямёнаўны Сіланцьевай».